5 В одних случаях, значения слов приводятся в тексте или их можно вывести из контекста, в других – необходимо обращение к различным словарям.

**Литература**

1 Туркменские сказки об Ярты-гулоке / отв. ред. Р. И. Филиппова. – Ленинград : Детгиз. – 132 с.

2 Крысин, Л. П. Иноязычные слова в современном русском языке / Л. П. Крысин. − М., 1968. − 208 с.

***А. В. Рудніцкая***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна****,*
*канд. філал. навук, дацэнт*

## СВЕТ ЯК СІМУЛЯЦЫЯ Ў РАМАНЕ "П'ЯЎКА" Ю. СТАНКЕВІЧА

Свет рамана "П'яўка" Ю. Станкевіча палохае сваёй бязвыйсцевай жорсткасцю, маладушнасцю і духоўным выраджэннем яго насельнікаў. Аўтар стварае сімуляцыю рэчаіснасці, паказваючы эру гіперрэальнасці – эпоху, у якой малюнак важней за змест і ў якой парушана сувязь паміж прадметамі, з'явамі і іх знакамі.

Па словах Ж. Бадрыяра, "сімуляцыя – спараджэнне мадэляў рэальнага без арыгінала і рэальнасці: гіперрэальнага. У сваю чаргу, сімулякр – гэта малюнак без арыгінала, рэпрэзентацыя, тое, чаго на самой справе не існуе" [1].

Найбольш выразна выявіліся ў творы Ю. Станкевіча сімулякры, заснаваныя на мадэляванні і кібернетычнай гульні, мэта якіх – татальны кантроль.

У рамане "П'яўка" пісьменнік змяшчае герояў у матрычную сімуляцыю свету, у дыфузію ўсялякіх каардынатаў, у гіперрэальнае – рэчаіснасць без першапрычыны, без мінулага, без будучыні: "Улады пераконвалі насельніцтва ў тым, што наша цывілізацыя з'яўляецца безумоўна базавай, яе далейшы росквіт – наперадзе, а ідэі Сімуляцыі не толькі замоўчваліся, а і пры малейшым напамінку жорстка праследаваліся" [2, с. 26].

Галоўныя героі Берташ Яновіч і Мойра заклапочаны наступствамі тэхналагічнага развіцця і іх уплывам на чалавека і акалючае асяроддзе, якое насамрэч больш падобна да сімуляцыі пекла. Не дзіўна, што ў такой жорстай дэградуюча-дыстапічнай рэальнасці інтэлігенцыя загублена, а сапраўдныя навуковыя даследаванні (у творы – "доказы") амаль цалкам знішчаны. Аднак тут пануе НТП, а з ім і трансгуманістычныя ідэі аб неўміручасці чалавека, да якіх аўтар ставіцца крытычна: "Без старасці і смерці жыццё губляе сэнс" [6, с. 29]. Навука ў творы – усяго толькі фікцыя, якую стварыла ўлада дзеля кантролю над людзьмі. І ўсё ж героі рамана ўпэўнены, што шчасце недасягальнае без захавання ўласнай годнасці і годнасці Бацькаўшчыны.

Такім чынам, трансгуманістычная ідэя свету як сімуляцыі набывае ў рамане "П'яўка" Ю. Станкевіча адметную інтэрпрэтацыю, спалучаючыся з антыўтапічнай у сваёй аснове ідэяй татальнай падпарадкаванасці соцыуму штучнаму інтэлекту і абясцэньвання імкнення чалавецтва да неўміручасці.

**Літаратура**

1 Бодрийяр, Ж. Симулякры и симуляция [Электронный ресурс] / Ж. Бодрийяр. – Режим доступа: http://lit.lib.ru/k/kachalow_a/simulacres_et_ simulation.shtml. – Дата доступа: 12.04.2017.

2 Станкевіч, Ю. П'яўка / Ю. Станкевіч. – Мінск : "Галіяфы", 2010. – 280 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ